Такім чынам, для будучай акадэмічнай граматыкі важна захаваць прыназоўнік *аб* у рэкамендацыйных табліцах (разам з *у, пры, на, па*) для адлюстравання поўнага пераліку магчымых словаформ. З улікам наяўнай практыкі можна даць заўвагу аб пераважным выкарыстанні канструкцый *аб* + М. скл. у афіцыйна-дзелавым, навуковым стылях.

УДК 811.161.3:81’367.332.1

І. У. Капцюг, дац., канд. філал. навук (ВА РБ, г. Мінск)

## ФУНКЦЫІ ЗВАРОТКА Ў МОВЕ МАСТАЦКІХ ТЭКСТАЎ

Пытанне функцый звароткa закранаецца многімі лінгвістамі і з’яўляецца адным з самых істотных пры даследаванні гэтай моўнай адзінкі. Тым не менш, на сённяшні дзень мовазнаўцы яшчэ не выпрацавалі адзінага погляду на функцыі звароткa ў мове: адны даследчыкі выдзяляюць толькі дзве функцыі, уласцівыя звароткy, іншыя адзначаюць функуцыянальную разнастайнасць звароткa.

Даследаванне, праведзенае на матэрыяле твораў мастацкай літаратуры, дазваляе вылучыць наступныя функцыі звароткa: намінатыўную, характарыстычна-эматыўную, мадальную, устанаўлення кантакту, падтрымання кантакту, завяршэння кантакту. Функцыі звароткa цесна звязаны паміж сабой, і ў шэрагу выпадкаў бывае цяжка адмежаваць адну функцыю ад другой.

Адрасат маўлення пры намінатыўнай функцыі звароткa выражаецца разнастайнымі лексічнымі сродкамі, выбар якіх звычайна дыферэнцыраваны жанрам тэксту. У празаічных творах дамінуюць звароткі, якія называюць асобу чалавека па імені, імені па бацьку, імені і імені па бацьку, прозвішчы, сваяцтве, узросце, роду заняткаў, званні, пасадзе і інш.: *Добры дзень, **Алёша**; Працуйце, **маэстра**.* У вершаваных творах дамінуюць звароткі, якія называюць птушак, жывёл, расліны, прадметы рэчаіснасці, абстрактныя паняцці і інш.: *Не кувай ты, **шэрая зязюля**, сумным гукам у бары; Няма, **ваўчок**, табе збавення!* Ужыванне лексічных сродкаў адрозніваецца таксама паводле граматычнай катэгорыі адушаўлёнасці / неадушаўлёнасці назоўнікаў. Звароткі, выражаныя адушаўлёнымі назоўнікамі, характэрныя для ўсіх літаратурных жанраў і складаюць 88,1% ад агульнай колькасці адабраных адзінак. Лексіка-семантычныя групы звароткаў, выражаных неадушаўлёнымі назоўнікамі, зафіксаваны, у асноўным, у паэтычных творах майстроў слова і складаюць 11,9% ад агульнай колькасці ілюстрацыйнага матэрыялу.

Характарыстычна-эматыўная функцыя выяўляецца ў здольнасці звароткa выступаць у якасці сродку характарыстыкі адрасата, а

таксама выражаць пачуцці і эмоцыі да субяседніка.

Аналіз фактычнага матэрыялу паказаў, што звароткі, ужытыя ў гэтай функцыі, выражаюць суб’ектыўныя адносіны да адрасата і падзяляюцца на дзве групы: 1) звароткі са станоўчай характарыстыкай адрасата; 2) звароткі з адмоўнай характарыстыкай адрасата. Станоўчая ці адмоўная характарыстыка заключаецца ў семантыцы слова (*золатца, радасць* ці *паразіт, гультай*) або выяўляецца ў кантэксце. У залежнасці ад гэтага звароткі ўжываюцца з прамым значэннем (*краса, малайчына, дарагі, мілы* ці *адступнік, ахламон, гад, здраднік, дурны, абвінавачаны*) або з пераносным значэннем (назвы раслін, жывёл, прадметаў рэчаіснасці пры адрасацыі асобам, напрыклад, *зязюля, лябёдка, каток, кветачка, авечка, акула, качарэжка, чурбан, лапаць*): *А матылёк ужо не б’ецца: табе ахвяра ён,* ***краса****!; І ты прыйшла,* ***каханая****, прыйшла і асвяціла дні мае цяжкія; Нашто прадаў ты свой народ,* ***адступнік****?; Каб вам аслепнуць,* ***праклятыя****!; Хоць маму ўважыў бы,* ***таўкач****!; Каго ты слухаеш,* ***бахіла старая****?!* Пры выкарыстанні зваротка ў пераносным значэнні на першы план выступаюць дадатковыя семы значэння слова. Звароткі з суфіксамі суб’ектыўнай ацэнкі прыўносяць у асноўнае значэнне слова дадатковыя канататыўныя значэнні.

Функцыя характарыстыкі цесна пераплятаецца з эматыўнай функцыяй і ў некаторых выпадках не ўяўляецца магчымым устанавіць крытэрыі гэтага размежавання, таму варта разглядаць іх як адзіную характарыстычна-эматыўную функцыю. Для выражэння характарыстычна-эматыўнай функцыі ўжываюцца наступныя лексіка-граматычныя разрады слоў: назоўнікі, субстантываваныя прыметнікі, субстантываваныя дзеепрыметнікі (*краса*, *мілы*, *апечаны*).

Мадальную функцыю выконваюць звароткі-рэгулятывы, якія страцілі сваё першаснае значэнне роднасці і адрасаваны знаёмым / незнаёмым людзям. Яны выражаюць адносіны адрасанта да субяседніка, не называючы яго асабістых прымет, якасцей, характарыстык: ***Цётка****, а Сакаўшчына далёка? – запытаўся Азевіч, як кабета трохі прыціхла ад свайго плачу*; *Старая жанчына з сухімі вачыма сказала: “Заходзьце, пагрэйцеся,* ***дзеткі****”.*

Па ступені дэсемантызацыі звароткі-рэгулятывы падзяляюцца на тры падгрупы паводле захавання сацыяльных прымет адрасата: 1) рэгулятывы, якія маюць найбольшую ступень дэсемантызацыі, бо імі можа быць названы чалавек любога полу і ўзросту (мужчына, жанчына, дзіця): *брат, браце, дружа, голубе, чалавеча, таварыш*; 2) звароткі, якія пры ўсёй блізкасці да рэгулятываў першага тыпу паведамляюць пра пол адрасата: *грамадзянін* і *грамадзянка*; 3) звароткі-рэгулятывы, якія маюць найменшую ступень дэсемантызацыі, паколькі характарызуюць субяседніка па прымеце

ўзросту і полу: *маці, бабуля, дзядуля, сынок, дачушка, дзядзька, цётка*. У марфалагічных адносінах сярод частотных звароткаў-рэгулятываў першага тыпу пераважаюць назоўнікі ў форме клічнага склону (*браце, дружа, чалавеча, голубе*). З дапамогай рэгулятываў адрасант звяртаецца да сваякоў і да чужых людзей, да мужчын і да жанчын, да малых дзяцей, да прадстаўнікоў расліннага і жывёльнага свету, да неадушаўлёных прадметаў. Аналіз ілюстрацыйнага матэрыялу сведчыць, што ў творах мастацкай літаратуры ступень ужывання звароткаў-рэгулятываў неаднастайная. Найбольш распаўсюджаны назоўнікі з каранёвай марфемай *брат-Ø* (36,3% выпадкаў), астатнія лексемы менш пашыраны: *Гэта быў Амелькаў знаёмы. – Здароў, **брат**, – сказаў Амелька, падыходзячы блізка*. У марфалагічных адносінах сярод частотных звароткаў-рэгулятываў пераважаюць назоўнікі ў форме клічнага склону (*браце, дружа, чалавеча, голубе*): *Сумна, **дружа**, мусі?; Што з табою, **чалавеча**?*

Функцыі ўстанаўлення, падтрымання і завяршэння кантакту з адрасатам адлюстроўваюць працэс камунікацыі і залежаць ад структурна-сэнсавай арганізацыі сказа: пры ўстанаўленні кантакту з адрасатам зваротак займае пераважна інтэр- або постпазіцыйнае становішча, пры падтрыманні і завяршэнні кантакту стаіць у любым месцы сказа. Каб выклікаць субяседніка на размову і паспяхова наладзіць зносіны з ім, пажадана ўжыць такі зваротак, які ўкажа на прыхільнасць да адрасата: *Здарова, **Рыгор Андрэевіч**!; Заходзь, праходзь смялей, прысядзь, **каханы**, пабудзь са мной*. Зваротак неабходны не толькі для ўстанаўлення кантакту з адрасатам, але і для падтрымання кантакту з ім. Каб не гублялася ўвага субяседніка да прадмета размовы, адрасант у працэсе гутаркі звяртаецца да адрасата, называючы яго па імені, бо, калі чалавек чуе сваё імя, гэта адразу прыцягвае яго ўвагу і павышае шансы ўспрыняць пачутае: *Што ж мне рабіць, **Наташа**; Дзеля Валодзі, **Сашачка**, памажы мне*… У працэсе гутаркі адрасант можа звяртацца да чалавека не толькі па імені, а ўжываць намінацыі роднасці і сваяцтва, назвы асоб паводле полу і ўзросту і іншыя словы: ***Мамка**, ці ты ўсё чула?; А ну, **сынок**, за плуг вазьміся, глядзі, трымай яго мацней.* Для звароткa характэрна таксама функцыя завяршэння кантакту. Завяршэнне размовы звычайна адбываецца ў сітуацыі развітання. Камуніканты імкнуцца быць ветлівымі адзін з адным, застацца ў добрых узаемаадносінах: *Добрай ночы, **Даніла Платонавіч.*** Такім чынам, ілюстрацыйны матэрыял сведчыць аб тым, што зваротак дапамагае наладзіць кантакт з адрасатам, працягнуць размову ў жаданай танальнасці і служыць сродкам ветлівых зносін у сітуацыі развітання, спрыяе дасягненню ўзаемаразумення паміж людзьмі.